**Ансамбль танца “Свіцязяначка”** быў створаны ў 1987 годзе на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Навагрудскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”. Заснавальнікам ансамбля і мастацкім кіраўніком з'яўляецца Галіна Аляксееўна Апалонік. Калектыў атрымаў званне “ўзорны” ансамбль танца “Свіцязяначка” у снежні 2013 года (пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 года № 97). Асноўны напрамак працы ансамбля – беларускія народныя танцы, а таксама танцы славянскіх народаў.
Узорны ансамбль танца “Свіцязяначка” з’яўляецца ўдзельнікам і лаўрэатам шматлікіх абласных, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсаў і фестываляў: рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва “Dance city” (г.Мінск), Міжнародны фестываль дзіцячага танца “Зімовыя зоркі Дрэздэна – 2014” (г.Дрэздэн), V Міжнародны творчы фестываль дзяцей і моладзі “Хваля ідэй” (Балгарыя), абласны этап III Рэспубліканскага агляда-конкурсу дзіцячай творчасці “Прывітанне, свет!” (г.Гродна), фестываль сцэнічнага мастацтва “Dance of Europe” у рамках Міжнароднага моладзевага праекта “Тыдзень дзяцей і моладзі” (г.Мінск).
У 2017 годзе калектыў прыняў удзел у XVIII адкрытым рэгіянальным фестывалі-конкурсе дзіцячага аматарскага харэаграфічнага мастацтва “Крыштальны чаравічак” (г.Ліда, дыплом фіналіста), XVIII адкрытым рэгіянальным фестывалі-конкурсе дзіцячага аматарскага харэаграфічнага мастацтва “Крыштальны чаравічак” (г.Ліда, лаўрэаты III ступені); XVIII адкрытым рэгіянальным фестывалі-конкурсе дзіцячага аматарскага харэаграфічнага мастацтва “Крыштальны чаравічак” (г.Ліда, лаўрэаты III ступені).





